

## Анжаліка Бараноўская

# Мой Купала

Да мяне ты прыйшоў нечакана,
Мой любімы паэт, мой Купала.
Не магла я сядзець, не магла я цярпець,
Так хацелася з лётчыкам мне паляцець.

Са жняёю асенняе поле я жала,
І з Алесяй пра зорнае неба спявала…
Беларускай дзяўчыначкай залюбавалася,
Што найлепшая ў свеце, пра гэта дазналася.

Як лілея, як краска, яна чараўніца,
Прыгажосцю сваёй азарае святліцу.
Ганаруся яшчэ я яго Бандароўнай,
Годнай, па смеласці з мужчынамі роўнай.

На раскіданым гняздзе я торбу шыю,
І паэт-прарок дае мне крылы.
Годзе ўжо бед і годзе нягод!
Я іду з табой на Вялікі Сход!

Не хачу безназоўную маці любіць,
І проста тутэйшай не варта мне быць!
Я знаю: і нашай любові чакае
Беларусь-нявеста, Беларусь маладая!

Мой любімы Купала не проста паэт,
Ён філосаф, асветнік, адкрыў цэлы свет.
І калі я адказаў на штосьці не знаю,
Я кнігу бяру і  Купалу чытаю.

***

Школа – пачатак жыццёвых дарог,
Першых натхненняў і першых трывог.
Школа – надзейны аплот і аснова,
Нашых настаўнікаў родная мова.

Школа –  чытанне, імкненне, пазнанне,
Нас сустракае кожнае ранне.
Школа – крыніца і таямніца,
Тут нас чакае мноства адкрыццяў.

Школа – сяброўства, сустрэчы, спатканне,
Дружбы вытокі і шчодрасць кахання.
Школа – прыступкі ў свет навукі,
Гэта падтрымка, надзейныя рукі.

Школа – рамантыка і спасціжэнне,
Час разважанняў, юнацкіх сумненняў.
Школа – званкоў пералівы і крокі,
Перажыванні, любімыя ўрокі.